Дзяржаўная ўстанова культуры
«Шаркаўшчынская цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма»
Шаркаўшчынская раённая бібліятэка



# ГЕРОЙ ДАЎНО АДГРЫМЕЎШАЙ ВАЙНЫ

## Пошукова-даследчая праца

Падрыхтавала:
Бука Валянціна Іванаўна,
бібліятэкар

2024



# ІГНАЦЬЕЎ МІХАІЛ КУПРЭЕВІЧ

- Месца нараджэння:

В. Юркавічы Гарадоцкага раёна, Віцебскай вобласці, БССР

- Дата нараджэння: 1904 год
  Нацыянальнасць: беларус

Узнагароджаны



Прадстаўлены да ўзнагароды:
 Ордэн Чырвонай Зоркі;
 Ордэн Чырвонага Сцяга

Ігнацьеў Міхаіл Купрэевіч - адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Вілейскай вобл. у гады Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзіўся на хутары Юркавічы Гарадоцкага раёна Віцебскай вобл. У 1931 годзе Міхаіл Ігнацьеў уступіў у рады камуністычнай партыі, быў старшынёй сельсавета, сакратаром райвыканкама ў Гарадоцкім раёне. У самым пачатку вайны Ігнацьева як афіцэра запасу забралі ў войска. У хуткім часе яго назначылі палітруком. З адступленнем Чырвонай Арміі яму давялося зведаць горыч палону. 12 ліпеня 1941 года, кантужаны, ён быў схоплены немцамі, але паспеў схаваць партбілет, таму ў лагеры ваеннапалонных Ігнацьеў праходзіў як звычайны салдат, а не палітрук. Праз пяць дзён яму пашчасціла збегчы з палону, і некаторы час ён хаваўся на Смаленшчыне. Мужчыну не пакідала думка пра барацьбу з гітлераўцамі. У маі 1942 года Ігнацьеў устанаўлівае сувязь з народнымі мсціўцамі і становіцца палітруком узвода трэцяга партызанскага атрада брыгады Дзячкова, якая дзейнічала на тэрыторыі былых Усвяцкага і Мехаўскага раёнаў Віцебскай і Смаленскай абласцей.

У Віцебскім падпольным абкаме кампартыі Міхаіл Ігнацьеў атрымаў важнае заданне: прабрацца ў тыл ворага, каб падняць людзей на барацьбу. Месцам яго дыслакацыі выбралі тэрыторыі Міёрскага, Шаркаўшчынскага, Пастаўскага і Відзаўскага раёнаў. У тыл праціўніка закінулі 65 чалавек, Ігнацьеў стаў камісарам гэтай дыверсійнай групы.

29 жніўня 1942 года яны прыйшлі ў вёску Журавоўшчына, каб у хуткім часе стаць ядром брыгады “Спартак”. Атрад з кожным днём рос і ў хуткім часе дасягнуў 350 чалавек. Камісарам яго з’яўляўся Міхаіл Ігнацьеў. У самым пачатку сваёй дыверсійнай дзейнасці партызаны напалі на кардонную фабрыку ў вёсцы Плятарова на Відзаўшчыне, рабілі засады на немцаў каля вёскі Дубраўка, знішчылі 4 аўтамашыны і некалькі гітлераўцаў. У дзень 25-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі народныя мсціўцы напалі на варожы гарнізон у Іёдах, разграмілі яго і захапілі з сабой зброю. Потым імі былі знішчаны гарнізоны ў Опсе, Казянах. У 1942 годзе ў Вілейцы дзейнічала школа нямецкіх афіцэраў. Менавіта ім было даручана ліквідаваць партызанскія злучэнні ў казянскіх лясах. Атрад з двухсот акупантаў быў поўнасцю знішчаны “спартакаўцамі” каля вёскі Азярава. Раззлаванае такой няўдачай нямецка-фашысцкае камандаванне вырашыла адпомсціць партызанам. На іх знішчэнне былі накіраваны 16 тысяч нямецкіх салдат. 22 лістапада варожае акружэнне часткова ўдалося прарваць, а вось 117 чалавек на чале з камісарам Ігнацьевым засталіся ў замкнёным праціўнікам коле. Партызаны маглі ў любую хвіліну загінуць, але тут ім дапамог выпадак. Уначы немцы бой не вялі, гэту акалічнасць і выкарысталі народныя мсціўцы. Разведчык Міхаіл Сямёнаў паспрабаваў прапаўзці пад пражэктарамі танкаў, вылазка ўдалася — немцы яго не заўважылі. Адзін за адным, каб не парушыць цішыні, партызаны кláліся на снег і паўзлі, уцякаючы ад ворага. Некаторы час “спартакаўцы” знаходзіліся каля возера Нарач, а потым вярнуліся на месца сваёй пастаяннай дыслакацыі.

Да лета 1944 года брыгада “Спартак”прадстаўляла сабой грозную сілу, у ёй налічвалася больш 1500 чалавек, было 800 аўтаматаў і іншага ўзбраення. Партызаны за час вайны разграмілі 26 нямецкіх гарнізонаў, пусцілі пад адхон 36 варожых эшалонаў, каля Дзвінска (Даўгаўпілс) узарвалі 12 кіламетраў чыгункі. Але, на жаль, страты былі і сярод саміх “спартакаўцаў”. У баі пад Відзамі загінулі 50 партызан. З тых 65 членаў дыверсійнай групы, якая прыйшла ў Шаркаўшчынскі раён, у жывых засталося толькі 17. У ліпені 1944 года каля тысячы партызан уліліся ў рады Чырвонай Арміі, а яшчэ 500 засталіся аднаўляць разбураную вайной гаспадарку на вызваленай тэрыторыі. Сярод іх быў і Міхаіл Ігнацьеў, якога спачатку выбралі старшынёй Відзаўскага райвыканкама, а з 1945 года ён жыў і працаваў у Шаркаўшчыне на розных пасадах.

Скончыў свой зямны шлях бясстрашны палітрук у 1981 годзе, пахаваны на могілках “Мядвёдкі”. Побач з мужам знайшла свой вечны спачын і яго жонка – , якая памерла ў 1989 годзе.

Радзіма высока ацаніла заслугі Міхаіла Ігнацьева. Ён узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, “Знак Пашаны”, медалямі “За адвагу” і інш. Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, ветэран вайны вёў вялікую выхаваўчую работу сярод моладзі, сустракаўся з працоўнымі калектывамі.




Адзін з завулкаў у гарадскім пасёлку Шаркаўшчына сёння носіць імя камісара партызанскай брыгады “Спартак” Міхаіла Ігнацьева.

Спіс выкарыстаннай літаратуры:

1. Бригада “Спартак”. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://partizany.by/brigade/51/?ysclid=m0c6yias5x559613899. – Дата доступа: 28.08.2024 г.
2. Живы, пока о них помнят… [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://will-remember.ru/familii_na_i/ignatev_mihail_kapreevich.htm. - Дата доступа: 26.08.2024 г.
3. Игнатьев Михаил Купреевич. … [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://partizany.by/partisans/27932/?ysclid=m0c6jssnbp343224937. – Дата доступа: 28.08.02024 г.
4. Заўсёды застаўся камісарам. З успамінаў Ф.А.Конышава, былога намесніка камандзіра партызанскай брыгады “Спартак” // Памяць: Гіст. - дакум. хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – С. 259-260.
5. Проект районной газеты “Их именами названы улицы” [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.klich.by/?p=129352. - Дата доступа: 28.08.2024 г.
6. Райчонак, С. Аповед пра палітрука партызанскай брыгады “Спартак” /С.Райчонак //Кліч Радзімы. – 2003.

## З УСПАМІНАЎ КАМІСАРА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ “СПАРТАК” МІХАІЛА КУПРЭЕВІЧА ІГНАЦЬЕВА

Сярод шэрагу партызанскіх злучэнняў, якія вялі барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Шаркаўшчынскага і суседніх раёнаў, вялікая заслуга ў разгроме гітлераўцаў і набліжэнні перамогі належыць народным мсціўцам партызанскай брыгады ”Спартак“. Напярэдадні вялікіх бітваў з ненавіснымі захопнікамі былі ясна бачны светлыя гарызонты, ва ўсім адчувалася радасць жыцця. Людзі пачыналі жыць як ніколі заможна. Тады я працаваў сакратаром Гарадоцкага павятовага камітэта партыі. Часта сустракаўся з людзьмі. З кім бы я ні гутарыў, кожны радаваўся светламу жыццю.

Але грымнула вайна. Над намі навіслі чорныя хмары. Трэба было змагацца з ворагам. Праз некалькі дзён я ўжо быў у радах дзейнічаючай арміі. Пад Віцебскам наша дывізія трапіла ў акружэнне. Біліся да апошняга патрона. Група воінаў вырвалася ў глухі лес. Там мы арганізавалі партызанскі атрад. У сакавіку 1942 года мяне і Панамарова выклікалі ў Віцебскі падпольны абкам партыі і далі заданне стварыць партызанскую брыгаду. Панамарова назначылі камандзірам, мяне — камісарам. Першая аперацыя, праведзеная нашай групай (брыгады як такой яшчэ не было), — разгром невялікага гарнізона (10 немцаў і 20 паліцаяў), які ахоўваў кардонную фабрыку ў Плетарова (цяпер Браслаўскі раён).

Мы нястомна праводзілі масавую работу сярод насельніцтва. І ў канцы сакавіка 1943 года ў нашых радах было ўжо 400 народных мсціўцаў. Спачатку мы вялі разгром нямецкіх гарнізонаў. Адным з вялікіх лічыўся гарнізон у Каз'янах, у якім было 300 нямецкіх салдат і афіцэраў. Пры яго разгроме брыгада ўпершыню панесла вялікія страты. Былі яны і потым, бо гітлераўцы адчайна агрызаліся, ды ўзброены былі моцна, мелі шмат боепрыпасаў, аўтаматычнай зброі, агонь амаль заўсёды вялі з дзотаў. Фашысты вельмі ўмацавалі таксама гарнізоны ў Васевічах (Літоўская ССР), Опсе, Відзах.

Пры разгроме нямецкага гарнізона ў Опсе загінуў былы сакратар Відзаўскага райкама камсамола Васіль Чэрных, у баі за Васевічы — урач Зоя Бабкіна, камандзір трэцяга атрада Мікалай Ушакоў і многія іншыя. Памяць аб іх назаўсёды застанецца ў народзе, бо героі аддалі сваё жыццё за яго шчасце, вялікую будучыню. Яны не былі адзінокімі. На іх месцы станавіліся новыя і новыя байцы. К канцу 1943 года брыгада "Спартак" налічвала 1500 народных мсціўцаў. Акрамя знішчэння жывой сілы ворага, брыгада вяла рэйкавую вайну. За гады барацьбы з захопнікамі нашы партызаны знішчылі 24 варожыя гарнізоны, пусцілі пад адхон 26 эшалонаў з жывой сілай і баявой тэхнікай гітлераўскіх войск. Свой баявы шлях брыгада закончыла разгромам гарнізона немцаў у Відзах. Там мы злучыліся з часцямі Савецкай Арміі."

Пра баявыя дзеянні атрада "Спартак" 1942 года 17 кастрычніка паміж мястэчкам Германавічы - Лужкі ў в. Ляскова, Пагоры, каля Ляснічэўкі, Мамантаўкі 2 разы ўспупалі ў бой з немцамі і паліцэйскімі, якія праследвалі нас. У гэтым баі знішчана 32 немцы, з нашага боку 1 забіты, 1 паранены. У баі ўдзельнічалі 1, 2, 3-ці п/о пад кіраўніцтвам Панамарова. 5 снежня сіламі партызан 2-га атрада ў 70 чалавек разбіты гарнізон у в. Гарбуны (30 чалавек), забіта 9 самаахоўцаў, узята зброя. М. К. Ігнацьеў, камісар брыгады "Спартак"

# М. К. ІГНАЦЬЕЎ



6 жніўня 1981 года пасля працяглай хваробы памёр член КПСС з 1931 года, персанальны пенсіянер рэспубліканскага значэння, былы камісар партызанскай брыгады «Спартак» Міхаіл Купрэевіч Ігнацьеў.

М. К. Ігнацьеў нарадзіўся ў 1904 годзе ў вёсцы Юрковічы Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і селяніна. Працоўную дзейнасць пачаў у 1916 годзе. З 1926 па 1941 год М. К. Ігнацьеў знаходзіўся на савецка-гаспадарчай рабоце.

М. К. Ігнацьеў быў слухачом партыйных курсаў пры ЦК КП(б) Беларусі, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. З першых дзён яе прымаў актыўны ўдзел у барацьбе супраць ворага. Пачынаў баявы шлях палітруком роты 20-га стралковага палка Заходняга фронту. А закончыў яго камісарам партызанскай брыгады «Спартак», якая дзейнічала на тэрыторыі нашага раёна.

Пасля вызвалення Беларусі працаваў старшынёй Відзаўскага райвыканкома, намеснікам старшыні Шаркаўшчынскага райвыканкома, старшынёй калгаса імя Суворава, займаў іншыя пасады.

З 1962 года — персанальны пенсіянер абласнога значэння, з 1967 — рэспубліканскага.

На ўсіх участках работы, якія давярала яму партыя, Міхаіл Купрэевіч з пачуццём высокай адказнасці адносіўся да даручанай справы. Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, М. К. Ігнацьеў праводзіў вялікую патрыятычна-выхаваўчую работу сярод моладзі, піянераў і школьнікаў.

Радзіма высока ацаніла заслугі М. К. Ігнацьева: ён узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны» і медалямі.

Светлая памяць аб Міхаіле Купрэевічы назаўсёды захаваецца ў памяці і сэрцах.

**М. Ч. Сезянеўскі, М. А. Таратута, І. С. Зайцаў, І. А. Аношка, Л. І. Новік, Ч. К. Сярповіч, С. І. Хаданёнак, С. К. Шынкевіч, Э. А. Камінскі, М. Д. Іваноў, П. І. Радзькоў, Л. П. Зайцава, Т. У. Кліманові ч, Г. Д. Гарбузаў, Э. А. Корсак, І. С. Шчарбакоў, І. І. Юкша, Р. С. Кудрын, Ф. К. Юрчанка, І. М. Гудоўскі, А. Л. Танканог, П. А. Балай, П. М. Баранаў і іншыя.**

Кліч Радзімы. – 1981 . – 8 жн. – С. 4

11 Вр.Зн 13

# НАГРАДНОЙ ЛИСТ.

Фамилия имя отчество Игнатьев Михаил Купреевич

Военное звание Политрук

Должность, часть Комиссар партизанской бр. „Спартак"

Представляется к Ордену „Красная Звезда"

1. Год рождения 1904 2. Национальность Белорус
3. С какого времени 4. Партийность член ВКП(б)

Состоит в Красной армии 26-6-1941 г.

Участие в боях где и когда Местечко Островно Витебской обл. июнь июль 1941 год.

Имеет ли ранения и контузии нет.

Чем ранее награжден знаки отличия Медаль Партизану Отеч. войны 1й степени

Каким РВК призван Городокский РВК

Постоянный домашний адрес: г. Городок Витебской обл. БССР представляемого к награждению или его семьи

Краткое конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг.

тов Игнатьев Михаил Купреевич один из старых командиров партизанской бриг. „Спартак" много сделал в вопросе организации бригады укреплении боевых и морально политических качеств. С момента создания бригады работает Комиссаром бригады „Спартак" при его личном и активном участии бригада сделала следующее: Разбито гарнизонов немцев, полиции 11, участие бригады в 20-ти навязанных боях немцами полицией в этих боях уничтожено 935 фрицев. 22 взято в плен.

18об

Взорвано ж.д. мостов 2, пущено под откос 4 эшелона 2 с живой силой 2 с военным имуществом, уничтожено ж.д. рельс 852, уничтожено телефонно телеграфной связи 15 к. разбито 3 автомашины, сожжено 38 ж.д. вагонов, сожжено мостов на шоссейных дорогах до 40, сожжена 1 электростанция 1 водокачка, сожжено 1 ж.д. станция 3 почты.

тов. Игнатьев М. К. заслуживает правительственной награды.

КОМАНДИР / НАЧАЛЬНИК / Командир парт. бр. политрук [illegible]

/ ЗВАНИЕ /

ЗАКЛЮЧЕНИЕ ВЫШЕСТОЯЩИХ НАЧАЛЬНИКОВ.

Тов. Игнатьев старейший партизан Витебской обл. Много поработал над созданием бригады „Спартак" и развитием партизанского движения в Городокском р-не Витебской обл.

Считаю необходимым представить тов. Игнатьева к правительственной награде — орденом Красного Знамени.

21/II-44 г.

Секретарь Витебского Обкома КП(б)Б. [illegible] /Климов/

ДОСТОИН ПРАВИТЕЛЬСТВЕННОЙ НАГРАДЫ ОРДЕНА КРАСНОГО ЗНАМЕНИ.

НАЧАЛЬНИК БЕЛОРУССКОГО ШТАБА ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ /П. КАЛИНИН/

" " __________ 1944 г.

201 об.

## АВТОБИОГРАФИЧЕСКИЕ ДОПОЛНЕНИЯ

Я Игнатьев Михаил Купреевич родился в 1904 году в семье крестьянина-бедняка Б.С.С.Р. Витебской области Городокского р-на Александровского с/с д. Юрковичи. Отец до революции 1917 года имел земли 1,5 га 9 человек семьи одну корову. После революции имел 8 га земли 2 коровы 1 лошадь. В 1929 г. вступил в колхоз где и жил до 1941 года в настоящее время где отец я не знаю. Я до 1924 года работал в сельском хозяйстве отца и с 1924 года начал работать в советских и хозяйственных организациях (смотри на обороте). Имею трех братьев, Игнатьев Леонид и Николай до войны были в Красной армии, старший брат Игнатьев Петр работал до войны 1941 года в городе Харькове на партийной работе инструктором райкома. Имею двух сестер одна вдовствовала перед войной 1941 г. уехала в гор. Выборг, а Игнатьева Александра жила в гор. Городке Витебской области. В настоящее время где кто с родных проживает я не знаю. Репрессированных родственников у меня нет, а также и за границей из родственников никто не проживает.

1/VIII 1944 г.
(дата заполнения)

Личная подпись: Игнатьев

Подпись тов. Комбриг. [illegible] заверяю

Должность (подпись)

3 августа 1944 г.

м. п.

[illegible]

---

Исх № 197с от 3.11.43 г.

206

очередного

политруку Игнатьеву Михаилу Купреевичу - комиссару партизанской бригады "Спартак", Белорусского штаба партизанского движения.

20.6.43 г.

1904 г. — чл. ВКП(б) с 1931 г.

белорус

среднее — не имеет

5.7.1941 г.

7а. в п/бригаде с 27.5.1942 г. — с 5.7.41 г. по 12.7.41 г.

не имеет

не имеет

не имеет

1941 г.

За время пребывания в партизанской бригаде т. Игнатьев показал себя преданным делу партии Ленина-Сталина и Социалистической Родине. Провел большую работу по организации партизанской борьбы с немецкими захватчиками. При участии в боях проявил находчивость в управлении боем и стойкость. Политически развит и морально устойчив. Дисциплинирован. С работой справляется хорошо. Имеет хорошую военную подготовку и умеет применять ее в бою. Знает тактику партизанской борьбы. Хорошо поставил политико-воспитательную работу, как в бригаде, так и среди мирного населения.

Достоин присвоения военного звания "Старший лейтенант".

Начальник Отдела кадров Белорусского штаба партизанского движения- подполковник (В. Романов)

октября 3

## Работа в прошлом и служба в Красной Армии
(с начала трудовой деятельности)

| года и месяц | по год и месяц | НАЗВАНИЕ ДОЛЖНОСТИ ИЛИ КАКУЮ РАБОТУ ВЫПОЛНЯЛ И ГДЕ (часть, соединение, фронт, город или район) |
|---|---|---|
| | | До 1924 года работал в с/хозяйстве отца Б.ССР |
| с 1924 | 1/V 1929 | работал секретарем Александровского с/с Городокского р-н |
| 1/V 1929 | 15/V 1931 | работал председателем Александровского с/с Городокского р-н |
| 15/V 1931 | 20/VI 1933 | секретарем Городокского райисполкома Б.С.С.Р. |
| 20/VI 1933 | 15/V 1936 | помощ. директора М.Т.С. I Городокская МТС |
| 15/V 1936 | 20/V 1939 | зам. заведующего Городокского райзо. |
| 20/V 1939 | 15/VI 1941 | зам. директора М.Т.С. по политчасти I Городокской МТС |
| 15/VI 1941 | 23/VI 1941 | партийные курсы при ЦК КП(б)Б г. Минск |
| 23/VI 1941 | 9/VII 1941 | на фронте м. Островно Витебской области 20 с.п. |
| 9/VII 1941 | 27/V 1942 | проживал на оккупированной территории именуемой Меховской р-н БССР |
| 27/V 1942 | 1/VIII 1944 | в партизанах, работал политруком взвода, комиссаром отряда и с 1/V 1943 года по 1/VIII 44 г. работал комиссаром партизанской бригады «Спартак» |

Игнатьев (подпись)

1/VIII - 1944 года

## ЛИЧНЫЙ ЛИСТОК ПО УЧЕТУ КАДРОВ

| | |
|---|---|
| 1. Фамилия, имя и отчество | Игнатьев Михаил Никифорович |
| 2. Воинское звание и занимаемая должность в настоящее время | Политрук, в настоящее время комиссар партизанской бригады «Спартак» |
| 3. Год и месяц рождения | 1904 года 23-го ноября |
| 4. Место рождения | Витебская область Городокский р-н Александровский с/с д. Юрково |
| 5. Национальность | белорус |
| 6. Соц. положение, профессия и происхождение | по соц. происхождению крестьянин, соц. положение служащий, профессии не имею |
| 7. Занятие родителей: а) До 1917 г. (чем занимались и где) б) После 1917 г. до настоящего времени в) место жительство родителей | до 1917 года родители занимались сельским хозяйством, после 1917 года тоже с/х. в 1929 году отец вступил в колхоз где и работал до 1941 г. Витебской области Городокский р-н Александровский с/с. В настоящее время где родители не знаю. |
| 8. Время вступления в ВКП(б) (или ВЛКСМ), какой организацией принят и № парт. или комсомольск. билета | член ВКП(б) с 1931 года принят Городокской парторганизацией Витебской области, № партбилета не помню. Партбилет уничтожен |
| 9. Выбывал ли из ВКП(б), когда и почему | из рядов ВКП(б) не выбывал |
| 10. Состоял ли в других партиях (каких, когда) | в других партиях не состоял |
| 11. Имел ли колебания в проведении линии партии, участвовал ли в оппозициях (когда, каких). Имеет ли партвзыскания (какие, кем наложены и за что) | Колебания в проведении линии партии не имел, в оппозициях не участвовал, партвзысканий не имел |
| 12. Образование: а) Общее (что и где окончил) б) Военное (что и когда окончил) в) Политическое (что и когда окончил) | Образование общее среднее. Окончил городское училище в 1920 г. Военного и политического образования не имею |
| 13. Знание иностранных языков | Иностранными языками не владею |
| 14. Ученая степень и имеет ли научные труды и изобретения | Не имею |
| 15. Был ли за границей (где, когда) имеет ли родственников за границей (кто, где находится) | За границей не был, родственников за границей нет. |
| 16. Был ли осужден, когда, кем за что и на сколько | судим, осужден не когда не был |

| | |
|---|---|
| 17. Когда (год, месяц и число), где по призыву или добровольно вступил в Красную Армию | В Красной армии не служил |
| 18. Состоял ли в Красной Гвардии, где, когда и в какой должности (или в партизанских отрядах) в период гражданской войны | Нет |
| 19. Участие в гражданской войне и в последующих боевых действиях по защите СССР после гражданской войны (когда где, в какой должности) | Участвовал в 1939 г. в польской кампании, работал в Красной армии в должности политрука роты воинскую часть не помню |
| 20. Находился ли на территории занятой белыми в период гражданской войны, где, когда и работа в это время | Нет |
| 21. Служил ли в старой армии, когда вступил и закончил службу, последний чин и должность | Нет |
| 22. Служил ли сам или родственники в белых иностранных армиях в период гражданской войны, где, когда, последняя должность, чин, участие в боях против Красной Армии | Нет |
| 23. Участие в отечественной войне (когда, где и последняя должность) | В 1941 году с 23/VI по 9/VII-41 г. был на фронте в 20 к. с.п. около гор. Витебск, политруком роты. |
| 24. Находился ли на территории, временно оккупированной немцами в 1941—1942 гг. где, когда и работа в это время) | С 9/VII-41 г. по 27/V-42 г. находился на территории оккупированной немцами Витебской области Городокского р-на скрывался от немцев |
| 25. Был ли в плену: а) Во время войны (1914—1918 гг.) б) В период гражданской войны в) В отечественную войну (указать где, когда, при каких обстоятельствах попал, как и когда освободился из плена) | В Отечественную войну во время окружения попал в плен к немцам, пробыл 5 дней и из плена бежал 20/VII-1941 года. В войне 1914-18 гг. не участвовал, в гражданской войне не участвовал. |
| 26 Имеет ли ранения, контузии, где, когда | Нет |
| 27. Какие имеет ордена СССР и награды, об'явление в приказах НКО когда награжден | Имею медаль I степени „Партизану Отечественной войны" награжден 15/VIII 43 года |
| 28 Семейное положение (женат холост), фамилия, имя и отчество жены, имена детей, их возраст и адрес семьи | Женат имею двое детей. Жена – Игнатьева Надежда Васильевна 32 года. Сын Геннадий 14 лет и сын Эдуард 8 лет. Адрес семьи не знаю. ~~[illegible]~~ |

Адрес 1941 года семьи: г. Городок Витебская область, Советская улица дом №19

# АТТЕСТАЦИОННЫЙ ЛИСТ

на присвоение очередного воинского звания
(первичного или очередного)

ст. политруку Игнатьеву Михаилу Кирилловичу — Комиссару партизанск. бригады „Спартак".

1. В занимаемой должности с 20.6.43 г. номер приказа о назначении ______ 2. Год рождения 1904 3. Партийность чл. ВКП(б) с 1931 г.

4. Национальность белорус.

5. Военное образование не имеет.

6. Общее образование среднее.

7. С какого года в РККА 5.7.1941 г. 8. С какого времени в действующей армии с 5.7.1941 г. по 12.7.1941 г.

8а. В партизанск. бригаде с 27.5.1942 г.

9. Награды за время отечеств. войны (когда, какие) не имеет.

10. Ранения за время отечеств. войны не имеет.

11. Дата о присвоении предыдущего звания 1941 г.

## АТТЕСТАЦИЯ

За время пребывания в партизанской бригаде тов. Игнатьев показал себя преданным делу нашей Социалистической родины товарищем. Проводил большую работу по организации партизанской борьбы с немецкими захватчиками. При участии в боях проявил находчивость, умение вести бои и стойкость. Политически развит и идеологически устойчив. Дисциплинирован. С работой справляется хорошо. ~~[illegible]~~ Имеет хорошую военную подготовку и умело применяет ее в бою. Знает тактику партизанской борьбы. Высоко поставил воспитательную работу, как в бригаде, так и среди местного населения.

Командир (начальник)

194 г.

Достоин присвоения воинского звания „Ст. лейт-т"

ПОСТУПИЛО 194_ г.

88 12об 12

Все графы заполнять полностью

# НАГРАДНОЙ ЛИСТ

Ордена Красного Знамени

1. Фамилия, имя и отчество Игнатьев Михаил Куприянович

2. Звание ________ 3. Должность, часть комиссар бригады „Спартак" Вилейской обл. БССР, член Витебского ПК КП(б)Б.

Представляется к награде орденом Красного знамени.

4. Год рождения 1904 г. 5. Национальность бел. 6. Партийность чл. ВКП(б)

7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) уч. Отечественной войны

8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне ________

9. С какого времени в Красной Армии ________

10. С какого времени в партизанском отряде с весны 1942 г.

11. Чем ранее награжден (за какие отличия) ________

12. Адрес места рождения представляемого к награждению и адрес его семьи Городокский р-н Витебской обл. БССР.

ДЛЯ ПОДШИВКИ

1. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

Тов. Игнатьев — участник, командир и политработник в партизанском движении Витебской и Вилейской обл. БССР с ранней весны 1942 г. Во 2-й Бел. бригаде — Меховский р-н Витебской обл. — тов. Игнатьев был политруком взвода, роты. В Вилейской обл. — комиссар бригады „Спартак", созданной при его активном участии.

Бригада „Спартак" под командованием Помазова, Игнатьева и др. начиная с осени 1942 г. ведет борьбу с оккупантами в р-не Вилейка—Браслав—Шарковщина. В партизанское движение вовлечены новые [illegible]. В [illegible] активных борцов с нем. захватчиками. Теперь в этой группе р-нов действует пять партизанских бригад. В неоднократных боях бригада разгромила ряд вражеских гарнизонов (Козяны, [illegible], [illegible] и др.) и вооружила. Тов. Игнатьев достоин высокой правительственной награды. Секретарь Вилейского обкома КП(б)Б [illegible]

---

Достоин правительственной награды — ордена КРАСНОГО ЗНАМЕНИ.

НАЧАЛЬНИК БЕЛОРУССКОГО ШТАБА ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ /П. КАЛ

" " .........1944 г.

Отд. кадров

От 19с
6.10.44г.

Вх. №1708с
6.10.44г.

208

Служебная характеристика.

Видана комиссару бригади „Спартак"
тов. Игнатьеву Михаилу Куприевичу.

Тов. Игнатьев партизан с 22 мая 1942 г., организатор партизанского отряда, ответственний и честний товарищ, как коммунист с честью виполняет свой долг перед родиной. В настоящее время занимает должность комиссара бригады „Спартака".

22.VIII.1943 г.

Уполномоченний Центрального
Штаба по бригадам Вилейской области
Комбриг Марков